ПРОЛЕТАРЫ УСІХ КРАЁЎ ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

ЧЫРВОНАЯ ЗЬМЕНА

№ 31 (998) | ПЯТНІЦА, 7-га лютага 1930 г.

ШТОДЗЁННАЯ ГАЗЭТА РАБОЧА-СЯЛЯНСКАЙ МОЛАДЗІ
Орган ЦК і Менскага АК ЛКСМБ
УМОВЫ ПАДПІСКІ:
1 месяц . . . 30 кап.
3 месяцы . . . 90 „
6 месяцаў . . . 1 р. 80 „
1 год . . . . 3 р. 30 „
АДРАС РЭДАКЦЫІ:
Менск, вул. Карла Маркса, 38
Тэлефоны: рэдактара—7-25,
сэкратарыят—12-19.
АДРАС КАНТОРЫ:
Комсамольская 25, тэлеф. № 903.
ГОД ВЫДАНЬНЯ IX.

Колектывізацыя і ліквідацыя кулацтва, як клясы

Пастанова ЦВК і Савету Народных Камісараў СССР аб мерапрыемствах па ўзмацненьню соцыялістычнай перабудовы сельскай гаспадаркі ў раёнах суцэльнай колектывізацыі ўносіць поўную яснасьць у пытаньне аб ажыцьцяўленьні політыкі ліквідацыі кулацтва. як клясы.

Паказаная пастанова забараняе прыстасаваньне ў індывідуальны гаспадарках наёмнай працы і арэнду зямлі, а таксама прадстаўляе мясцовым выканкомам у раёнах суцэльнай колектывізацыі права „поўнай конфіскацыі маемасьці кулакоў і высяленьня іх з межаў асобных раёнаў і краёў (вобласьцяй)".

Барацьба рабочай клясы пад кіраўніцтвам ленінскай партыі за соцыялістычную перабудову сельскай гаспадаркі сустракае поўнае падтрыманьне ня толькі батрацка-бядняцкіх мас, але і пераважнай большасьці серадняцкіх мас сялянства, якія павярнуліся тварам да колгасу, да комунізму.

Барацьба за ўзмацненьне колгаснай сыстэмы, за організацыю і згуртаваньне вакол задач соцыялістычнай перабудовы вёскі батрацтва і беднаты, за мобілізацыю асноўных мас сялянства на апошні і рашучы бой з кулацтвам у раёнах суцэльнай колектывізацыі—патрабуе ад нас напружаньня ўсіх сіл, вытрымкі і шпаркасьці дзеяньняў.

Пераход ад політыкі абмежаваньня і выцясьненьня кулака да політыкі ліквідацыі кулацтва як клясы, мяркуе іменна пасьпяховае ажыцьцяўленьне асноўных задач—суцэльнай колектывізацыі, мобілізацыі і згуртаваньня бядняцка-серадняцкіх мас.

Іменна пагэтаму наша партыя ажыцьцяўляе політыку ліквідацыі кулацтва як клясы ў раёнах суцэльнай колектывізацыі ў меру перамогі буйнага колектыўнага пачатку над індывідуальнай дробнаўласьніцкай стыхіяй у тым альбо іншым раёне.

Што датычыцца другіх раёнаў, дык для іх для пасьпяховага правядзеньня імі задачы суцэльнай колектывізацыі сельскай гаспадаркі захоўвае сваю сілу політыка абмежаваньня і выцясьненьня кулацтва.

З тым большым напружаньнем сіл нашы організацыі павінны паскорыць ліквідацыю кулацтва як клясы ў раёнах суцэльнай колектывізацыі.

Нечага закрываць вока на тое, што ў шэрагу месц будуць спробы пайсьці па лініі найменшага супраціўленьня — голага раскулачваньня кулака шляхам адміністрацыйных мерапрыемстваў

Трэба зараз-жа ўсямерна ўзмацніць парткіраўніцтва ўсёй нашай барацьбой за соцыялістычную перабудову вёскі, за колектывізацыю сельскай гаспадаркі і ў прыватнасьці—ліквідацыі кулацтва як клясы ў раёнах суцэльнай колектывізацыі.

Гутарка ідзе не аб звароце да політыкі 1918 году, не аб голым раскулачваньні кулака і дзялежкі яго маемасьці і інвэнтару паміж беднякамі і г. д., а аб пераходзе да буйнай колектыўнай гаспадаркі, аб конфіскацыі ў кулацтва сродкаў вытворчасьці, інвэнтару і маемасьці і іх аграмаджаньня.

Пастанова ЦВК і Савету Народных Камісараў падкрэсьлівае, што „конфіскаваная маемасьць кулацкіх гаспадарак... павінна перадавацца ў недзялімыя фонды колгасаў у якасьці ўзносу беднякоў і батракоў, якія уступаюць у колгас".

Тым самым вызначаецца напрамак экспропрыіраваных сродкаў і разам з тым узмацняецца становішча беднаты і батрацтва ў колгасе.

Зусім відочна, што ажыцьцяўленьне разгрому кулацтва, конфіскацыі яго сродкаў вытворчасьці ў раёнах суцэльнай колектывізацыі—павінна выключаць якую-б-то ня было магчымасьць прыстасаваньня падобных дзеяньняў у адносінах серадняка.

Нашым партыйным, комсамольскім і іншым грамадзкім організацыям трэба тэрмінова перабудавацца, кінуць сілы на організацыю батрацтва і беднаты, на згуртаваньне вакол сельсаветаў, вакол задач соцыялістычнай перабудовы—асноўных мас сялянства. на мобілізацыю ўсіх працоўных вёскі для рашучага адпору кулаку, для шпаркага і поўнай ліквідацыі кулацтва як клясы ў раёнах суцэльнай колектывізацыі.

Ва ўсёй гэтай рабоце вялізарную ролю закліканы адыграць рабочыя, якія едуць у колгасы. Маючы добры політычны, вытворчы і організацыйны вопыт, пролетары павінны ў вёсцы стаць на чале гэтай вялізарнай барацьбы, дапамагчы організацыі беднаты і батрацтва, паскорыць выкарчоўваньне рэштак капіталізму ў вёсцы.

РЭЗОЛЮЦЫЯ

БЕЛБЮРО СЭКЦЫІ ПРАЦАЎНІКОЎ ДРУКУ АБ СЬВЯТКАВАНЬНІ ЮБІЛЕЮ БДВ, ПРЫНЯТАЯ 4-га ЛЮТАГА 1930 Г.

Белбюро сэкцыі працаўнікоў друку, заслухаўшы паведамленьне аб сьвяткаваньні 5-гадовага юбілею БДВ конзтантуе:

1. Сьвяткаваньню юбілею ня было надана грамадзка-політычнага характару, як гэта было прадугледжана спэцыяльнай дырэктывай ЦК КП(б)Б.

2. Факты, як з падрыхтоўкай, гэтак з самым правядзеньнем юбілею (мізэрная колькасьць справаздач БДВ перад рабочымі, адсутнасьць рабочых на юбілейным сходзе, характар упрыгожаньня залі, адсутнасьць портрэту Леніна), прамова кіраўніка БДВ тав. Шыпілы, у якой зусім адсутнічалі паказаньні на мінулыя нацыянал-дэмократычныя памылкі БДВ і патрэбнасьць іх выпраўленьня, гавораць аб тым, што гэтыя „юбілейныя" памылкі зьяўляюцца невыпадковымі, што яны зьяўляюцца лёгічным працягам тых політычных прарываў, якія мелі месца ў мінулай дзейнасьці БДВ.

3. Белбюро сэкцыі цалкам і поўнасьцю далучаецца да рэзолюцыі МенАК КП(б)Б, падцьверджанай ЦК КП(б)Б, якая робіць усе патрэбныя і політычныя вывады ў адносінах да кіраўніцтва БДВ, якое політычна абанкруцілася.

4. Белбюро прызнае сваю памылку ў тым, што яно ня прымала ўдзелу ў падрыхтоўцы і правядзеньні сьвяткаваньня і таму не змагло своечасова рэагаваць на выяўленыя зараз політычныя прарывы БДВ.

5. Белбюро сэкцыі лічыць неабходным:

а) правесьці з удзелам сэкцыі чыстку апарату БДВ ад варожых, ідэолёгічна-чужых элемэнтаў, якія ёсьць у апараце;

б) паставіць пытаньне аб знаходжаньні ў шэрагах сэкцыі і саюзу тых працаўнікоў БДВ, якія дапамагалі ў падрыхтоўцы і організацыі ў чужым нам напрамку юбілею БДВ.

в) [illegible] мясцкому правесьці адпаведную растлумачальную работу сярод членаў сэкцыі працаўнікоў БДВ аб вуроках юбілею.

г) паставіць пытаньне на ўсіх колектывах і на агульным сходзе працаўнікоў сэкцыі друку аб вуроках і політычных памылках БДВ.

Не спыняць барацьбы з нацыянал-дэмократызмам-найбольш небясьпечным на даным этапе!

Пастанова агульнага сходу ячэйкі КП(б)Б Белдзяржвыдавецтва

Агульны сход ячэйкі КП(б)Б заслухаўшы паведамленьне т. **Курціка**, аб рэзолюцыях бюро ячэйкі БДВ (ад 29 студзеня і 1 лютага), Бюро Фрунзэнскага РК КП(б)Б і пастанове аб'яднанага паседжаньня бюро Менскага АК і прэзыдыуму АКК КП(б)Б, **ухваляе цалкам далучыцца да гэтых рэзолюцый,** як поўнасьцю забясьпечваючых адзінства шэрагаў комуністычнай партыі ў барацьбе за генэральную лінію партыі, супроць правага ўхілу і прымірэнцтва да яго, супроць нацыянал-опортунізму—аднэй з раз навыглядаласьцей правага ўхілу, у барацьбе супроць беларускага нацыянал-дэмократызму, як найбольш небясьпечнага на даным этапе.

Вышэйпаказаныя рэзолюцыі даюць правільную бальшавіцкую ацэнку сутнасьці допушчаных у час сьвяткаваньня ў Менску юбілею БДВ політычных памылак, якія зьявіліся аб'ектыўнай дэмонстрацыяй супроць партыі з нацыянал-дэмократызмам і зьяўляюцца лёгічным працягам меўшыхся і раней у выдавецкай дзейнасьці БДВ буйнейшых політычных памылак.

Агульны сход партыйнай ячэйкі, у дадатак да сваіх ранейшых пастаноў, ухваляе:

1. За допушчэньне сыстэматычных політычных памылак (палітрэдагаваньне і ўхвала для друку антысавецкай кніжкі Зарэцкага „Падарожжа на Новую Зямлю", нацыянал-дэмократычныя памылкі ў час работы рэдактарам „Савецкая Беларусь", прымірэнчыя адносіны да барацьбы з нацыянал-дэмократызмам, якія выразіліся ў поўным абходзе пытаньняў барацьбы з нацыянал-дэмакратызмам у уступным слове на ўрачыстым пасяджэньні ў Доме Культуры, у змазаньні грамадзка-політычнага значэньня юбілею, у нерашучых выступленьнях на агульным сходзе ячэйкі па пытаньнях барацьбы з нацыянал-дэмократызмам, змазаньне у уступнай прамове на ўрачыстым паседжаньні політычных прарываў у выдавецкай дзейнасьці БДВ)—**лічыць, што тав. Шыпіла павінен быць выключан з шэрагаў комуністычнай партыі, але прымаючы пад ўвагу поўнае і безагаворачнае прызнаньне тав. Шыпіла політычнай шкоднасьці допушчаных ім грубейшых політычных памылак, а таксама яго рэволюцыйнае мінулае, агульны сход ухваляе абмежавацца суровай вымовай з папярэджаньнем і зьняць тав. Шыпіла з кіруючай работы.** Ячэйка папярэджае т. Шыпілу, што паўтарэньне ім у будучым якіх небудзь яго ранейшых політычных памылак павядзе за сабой безагаворачнае выключэньне з партыі.

2. **Тав Цьвікевічу,** які як член праўленьня, нясе адказнасьць за допушчаныя праўленьнем БДВ сыстэматычныя грубейшыя політычныя памылкі, улічваючы [illegible] поўнае адсутнічаньне ў Менску у час падрыхтоўкі юбілею—абвясьціць **вымову**

Паставіць пытаньне перад адпаведнымі органамі аб выказаньні ранейшай пастановы РК КП(б)Б аб зьняцьці т. Цьвікевіча з кіруючай работы у БДВ, заставіўшы разам з гэтым яго на меньш адказнай рабоце ў БДВ.

3 **Тав. Раю,** намесьніку загадчыка БДВ, які нясе пэрсональную адказнасьць за допушчаныя праўленьнем БДВ грубыя політычныя памылкі — **абвясьціць суровую вымову.**

4. **Тав. Календа,** члену камісіі па падрыхтоўцы ўрачыстага паседжаньня, які уехаў па асабістаму настаяньню у час падрыхтоўкі да юбілею ў камандыроўку—**абвясьціць вымову.**

5. **Тав. Багушэвічу,** які быў у курсе падрыхтоўкі юбілею і не паведаміў своечасова бюро аб допушчаных політычных памылках—**абвясьціць вымову.**

Ганебнае цкаваньне СССР

Ангельскія цьвёрдалобыя самымі ганебнымі дыплёматычнымі сродкамі падрыхтоўваюць разрыў з Савецкім Урадам

ЛЁНДАН, 6. Ангельскі консэрватыўны друк працягвае сваю ганебную кампанію правакацыі, накіраваную супроць СССР. Выказваючы незадаваленьне адказамі Гэндэрсона ў палаце вобшчын на запытаньні цьвёрдалобага Чэмбэрлена аб «пропагандзе з Масквы», амаль што усе консэрватыўныя газэты заяўляюць, што ў палаце вобшчын будуць зададзены новыя пытаньні аб пропагандзе.

Орган ангельскай компартыі «Дэйлі Уоркер» у артыкуле, прысьвечаным антысавецкай кампаніі зазначае, што цкаваньне Савецкага Саюзу, якое пачалася ва ўсіх капіталістычных краінах мае мэтай падрыхтоўку вайны супроць пролетарскай дзяржавы. Па словах газэты, на чале антысавецкай кампаніі стаіць ангельскі рабочы ўрад, які падрыхтоўвае разрыў з Савецкім урадам самымі ганебнымі дыплёматычнымі сродкамі. Газэта падкрэсьлівае, што антысавецкае цкаваньне невыпадкова саўпадае з паседжаньнямі Лёнданскай марской конфэрэнцыі.

«Тут,—піша газэта,—цэнтр усіх антысавецкіх інтрыг, тут імпэрыялістычныя бандыты імкнуцца ўсімі сіламі ўладзіць рознагалосьсі для таго, каб стварыць адзіны фронт супроць бацькаўшчыны працоўных—СССР».

Справа 153-х

ТОКІЁ, 5. Па паведамленьнях агенства «Дэмпо Сусін», папярэдняе сьледзтва па Сафійскай справе 153-х абвінавачваемых у прыналежнасьці да компартыі скончана. Матар'ялы сьледзтва складаюць 50 томаў з агульнай колькасьцю 25 тысяч старонак. Суд будзе ў сакавіку.

З жыцьця Далёка-Усходняй арміі

Генэрал Лян каля трупу Запарына

Імя камандзіра разьдзелу, сэкратара ротнай ячэйкі тав. Запарына, незабываемай ранай застанецца ў сэрцы кожнага байца Асобай, кожнага працоўнага краіны Саветаў.

Той, хто хоць раз чуў яго гарачыя, поўныя агню і прасякнутыя няпрымірымай клясавай ненавісьцю да ворагаў рабочай клясы слопы, назаўсёды ўяўляў у сваёй памяці каранастую, жыцьцярадасную фігуру камандзіра.

Гэты стойкі камуністы, бясстрашны баец зьверска замучаны белакітайцамі і рускімі белагвардзейцамі.

Аб апошніх хвілінах тав. Запарына перадае яго саслужывец па палку, камандзір разьдзелу т. Лебедзяў.

— Камандзіра Запарына мы страцілі ў эдпорным баю пад Манчжурыяй. Ад разьезду 86 выступалі ноччу з мэтай ліквідаваць няраз пераходзячыя на нашу тэрыторыю банды праціўніка.

— Тав. Запарын быў на левым флангу цэпі і адзін з першых ускочыў на бліндаж ворага. Рэйка - бітонныя прыкрыцьці аказалі надзвычайную абарону белакітайцам. Прышлося выбіваць іх пад градам куль—штыхом і гранатай праз байніцы. Тав. Запырын захаваў спакой у самы разгар бойкі. Дзевяць гранат спусьціў ён у вакенцы бліндажоў ворагу. Выстрэл белакітайца зваліў бесстрашную фігуру камандзіра. Запарын паваліўся. І больш мы яго ня бачылі.

Ранены тав. Запарын, пяпрыкмечаны адыйшоўшымі на сваю тэрыторыю часьцямі Чырвонай арміі застаўся ляжаць на кітайскай зямлі і толькі пасьля таго, як Асобая канчаткова ліквідавала банды налётчыкаў, удалося знайсьці скалечаны труп т. Запарына.

Труп быў паказаны інтэрніраванаму Чырвонай арміяй камандзіру 15 мукдэнскай брыгады генэралу Ляну, дзе праз пераводчыка памочніка начальніка Н-скага пагранатраду АДПУ т. Клінрўскім быў утвораны апрос Ляна.

Характэрны падрабязнасьці гэтага апросу.

Пытаньне генэралу Ляну:

— Прад'яўлены генэралу Ляну труп камандзіра Чырвонай арміі знойдзены на палову закапаны на кітайскай тэрыторыі, у раёне гораду Манчжурыі, з забітымі ў вочы гільзамі патронаў, расьсечанымі палавымі органамі, двума штыхавымі ранамі ад нажавога штыха у правым бядры, адной штыхавой ранай у верхняй часьці пляча і праломленай тупой зброяй галавой. Агнястрэльных ран, акрамя адной раны ў жывот, ня было. Труп быў зьвязаны па нагах вяроўкай. Акт мэдыцынскай камісіі сьведчыць, што факт зьвязваньня па нагах і ўсе прызнакі ран гавораць аб тым, што да нанясеньня апошняй раны—шока ў галаву, ранены камандзір знаходзіўся ў момант узяцьця яго ў палон кітайскімі часьцямі пры жыцьці.

Труп замучанага белакітайцамі камандзіра т. Запарына.

— Ці прызнае генэрал Лян, што над раненым палонным камандзірам утвараліся кітайскімі вайсковымі часьцямі нячувана-зьверскія зьдзекі

Адказ Ляна:

— Так, я прызнаю, што раны нанесеныя прад'яўленаму мне трупу камандзіра Чырвонай арміі носяць характар зьдзеку над раненым альбо памёршым. Але можна допусьціць, што рана нанесеная тупой зброяй у палавы орган, нанясена мімаволі лапатай, пры выкапваньні трупу з зямлі. Мне-ж было давесена камандзірам часьці, што азначаны камандзір Чырвонай арміі быў знойдзены памёршым і пахаваны. Бой, дзе ён быў ранен, адбываўся на вучастку камандзіра 10-га кав. палка, які мне падпарадкаваны ня быў. Я не сумняваюся, што кітайскія салдаты, з прычыны сваёй дзікасьці, невуцтва маглі ўтварыць такія зьдзекі над палонным прадстаўніком Чырвонай арміі, але бяз ведама вышэйшага камандаваньня.

Пан генэрал! Мы таксама не сумняваемся ў „здольнасьцях" вашых салдат,—сьляпых выканаўцаў вашай волі і вывучкі. Кроў рабочых Кантонскай комуны, жахі засьценкаў Сумбею, абстрэлы і рабаўніцтва нашых мірных пагранічных паселішчэў навучылі нас не сумнявацца ў гэтым.

* * *

У Чырвонай сталіцы пролетарскай дзяржавы адбудзецца савецка-кітайская конфэрэнцыя па ўрэгуляваньню спрэчных пытаньняў, у выніку ліквідацыі конфлікту на КУ чыгунцы (гэтую конфэрэнцыю, трэба сказаць, імкнуцца адцягнуць кітайскія правіцелі).

Да патрабаваньняў савецкага ўраду павінен быць далучан яшчэ адзін крывавы рахунак незабываемыя мукі камандзіра Запарына. Гэты рахунак напомніць яшчэ раз усяму сьвету аб тым, якія катаваньні рабочай клясе, працоўным Савецкага Саюзу нанесла кітайская ваеншчына і азьвярэлая белагвардзейшчына.

М. Вошчын.

„Трывога"

СЬМЕЦЬЦЯ НЯМА--ЁСЬЦЬ ЗАЛАТАЯ ВАЛЮТА

ГОМЕЛЬСКАЯ ЗАЛІНЕЙНАЯ ОРГАНІЗАЦЫЯ САБРАЛА НЕКАЛЬКІ СОТ ПУДОЎ ЛОМУ І УЦІЛЮ

У савгасе Дукоры валяюцца тысячы пудоў уцілю і лому пад сьнегам.—Дудзіцкія коопэратары ня прымаюць уцілю.—Сяляне Харшунскага і Нова-Дворскага сельсаветаў ня ведаюць куды здаваць яго

ЯЧЭЙКІ, ПІОНЭРАТРАДЫ, ОРГАНІЗУЙЦЕ ЗБОР УЦІЛЮ!

Дэзэртыраў ня было

Комсамольцы Гомельскага Залінейнага раёну ў гадавіну сьмерці Леніна, сумесна з піонэрскай організацыяй гэтага раёну, наладзілі масавы паход за утыль-сыравінай надзвычайна добра. Зьявілася амаль 100 проц., чаго ніколі ня было. Ня было „дэзэртыраў“. Праўда, былі некаторыя падобныя на „маменькіных сынкоў“, якія гаварылі—„Што, мы ўсякую дрэнь будзем браць рукамі?“ Але такіх было зусім мало—адзінкі. Прышлі хлопцы з санкамі ў адзін двор, а гаспадыня іх сустракае:

— „Эх, хлопцы, ня ведаеце колькі залатых адкідаў хаваецца ў нас, цягнеце вялікія сані! І сапраўды прышлося прывезьці вялікія сані,—хламу было надзвычайна многа, ні ў якім разе на столькі не разьлічвалі. Але побач з гэтым, мы мелі (праўда, вельмі рэдка—таксама адзінкі) і такія факты, калі зборшчыкаў ня пускалі ва двор, не давалі хламу, хаця ён і быў. Напрыклад, рабочы НЕВАР (службы пуці)—член саюзу, замест таго, каб дапамагчы комсамольцам, выганяў іх з двара. Тут неабходна адзначыць, што Дзяржгандаль быў недастаткова падрыхтаваны. Член штабу РК па збору рызьзя ўмовіўся з Дзяржгандлем аб тым, каб падводы скідалі ўтыль-сыравіну ў склад па вуліцы Ланге, калі-ж туды прыехалі, то двор быў зачынены. Прышлося ехаць у другі склад (на краі гораду) дзе ня было вагаў. Сабраны лом скінулі ў кучу. Да сёньнешняга дня няма магчымасьці даведацца колькі пудоў сабралі. Члены штабу гавораць, што сабрана на 19 падвод, але мы памыліліся. Сабрана: утылю на 15 падвод, мэталю на 28 падвод.

Няма рызьзя, няма сьмецьця--ёсьць залатая сыравіна.

ЦІШКА ВЕРНЫ,

Збор уцілю

Зарысоўка юнкора „Сіні Ліст“

Гнуліся пад цяжарам хламу

Зьбярэм увесь лом і уціль

* У Горках па ініцыятыве Горсавету і школ быў організован збор уціло. У зборы прынялі ўдзел многа рабочых і школьнікаў. Сабрана больш 500 мядзяных падсьвечнікаў, некалькі дзесяткаў прымусаў і шмат іншых каштоўных рэчаў. Усе рэчы адданы ў Дзяржгандльбел.

ПУХАВІЦКІ.

* Вільшчынская ячэйка ЛКСМБ правяла сходы сялян па акаляючых вёсках, дзе ставілася пытаньне аб значэньні і зборы другараднай сыравіны. Маем добрыя вынікі. Сяляне з ахвотай зьбіраюць сыравіну і шмат яе ўжо нарыхтавалі.

ЮНКОР Ж.

* Жыхары вёскі Рэвінічы, Талочынскага раёну ўхвалілі агульным сходам здаць у каго-які ёсьць уціль і да гэтага дабавіць добраахвотны ўзнос грашыма ня менш 10 кап. За ўсе гэтыя сродкі будзе выпісана літаратура, якая будзе знаходзіцца пры школе гэтай вёскі, дзе вечарамі мяркуецца праводзіць чытку з актыўным удзелам комсамолу.

АСОТ.

* Гарочацкі піонэр-атрад зьбірае ўціль. Піонэры дапамагаюць комсамольскай ячэйцы. Попелу сабралі каля 10 пудоў і рознага лому каля 12 пуд.

БЯРОЗА.

* Халопенская ячэйка комсамолу, Менскай акругі была разьбіта на гурткі. Да кожнага гуртка была прымацована брыгада з трох альбо 4 чалавек. Брыгады выяжджалі ў вёскі і дзякуючы растлумачальнай кампаніі саляне дармова здаюць непатрэбныя рэчы. Усімі брыгадамі сабрана шмат чыгуну, касьцей, трап'я і г. д. Усё гэта здана коопэрацыі. Піонэр-атрад вылучыў піонэраў у дапамогу комсамольскай ячэйцы. Праца ідзе добра.

ГІРС АЛЕСЬ.

Залінейцы на зборы ўцілю

НА ЗДЫМКУ: удзельнікі паходу здаюць Уціль і лом.

Яны не клапоцяцца

— У савгасе Дукоры валяецца каля 1000 пудоў рознага лому. Загадчык савгасу па сваёй нядбайнасьці ня хоча перадаць гэтага лому Дукорскай спажывецкай коопэрацыі.

Лявіцкі

— Як раней, так і цяпер Лешненская ячэйка комсамолу на загатоўку другараднай сыравіны амаль не зьвярочвала ніякай увагі. Ніводнага сходу ня было праведзена, дзе-б стаяла гэтае пытаньне. Па ўсяму Лешненскаму сельсавету езьдзіць шмат прыватнікаў, якія скупляюць розны уціль. Комсамольская ячэйка стаіць у баку.

Лебяда

— Старшыня Дудзіцкай спажывецкай коопэрацыі працай па збору ўцілю ня цікавіцца. Калі селянін у коопэрацыю прынёс прадаваць конскі волас, прыказчык крамы Каваленка адказаў: „Мы гэтага не бярэм, а падругое ў нас няма расцэнкі, па якой можна было-б прымаць“. Селянін мусіў ісьці дамоў. Калі трэба прадаваць уціль, прыходзіцца несьці за 10 кілёмэтраў у Калінкавічы ў сельска-гаспадарчае таварыства.

Юн. селькор К.

— Па Гатовінскім сельсавеце сяляне ня ведаюць, для чаго патрэбен уціль і на што зьбіраюць яго. Калі спытаеш у сельсавеце ці ў ячэйцы як праходзіць праца, дык там адказваюць: „Гэта ня наша справа, пытай у таго, хто ведае“.

А-

— Загатоўцам другараднай сыравіны ў Жылнавецкім сельсавеце Глускага раёну зьяўляецца спажывецкая коопэрацыя. Да гэтага часу праца праходзіць самацёкам. Ня ўсе сяляне ведаюць, што і па якой цане можна збыць. Выкідваюць на задворкі шмат каштоўных рэчаў. Такое становішча не павінна адбівацца на загатоўцы уцілю

Юнкор

— У Заслаўскім раёне збор уцілю пачынаецца. У сельсаветах Шаршунскім, і Нова-Дворскім уціль ня зьбіраецца. Комсамольскія організацыі не праводзяць сходаў сярод сялян, самі таксама ня прымаюць удзелу ў гэтым. Некаторыя сяляне хочуць здаць, але ня ведаюць куды.

Шыдлоўскі

Комсамольцы з піонэрамі наладзілі паход

Піонэрбрыгада і піонэркамісіі, сумесна з ячэйкай ЛКСМБ Будакашалеўскага раёну паравоза-вагоннарамонтнага заводу імя Ланцуцкага, паладзілі масавы паход усёй грамадзкасьці колгасу імя Дзяржынскага і Любавінскага сельсавету па збору ўцілю. Збор праходзіў з вялікім энтузіязмам мас

У выніку было сабрана жалезнага лому 60 пудоў, старых галёш каля 7 пудоў, ануч—5 пудоў, касьцей—5, рэмняў—2 п.

Насельніцтва абяцала ў далейшым рэгулярна зьбіраць уціль.

Каганскі.

НАРЫС ЮНКОРА ЦІХОНА ПАЛЫНЬ

Ануча—залатая валюта

1. А яшчэ сьвядомым завешся!..

Надвор'е сёньня прыгожае. Мароз меншы стаў, вецер ня дзьме. У паветры разьліта вясновая цяплынь. У школе пачалі зьбірацца. Хутка дзесяць гадзін. Ідуць і ідуць вучні...

— Дарогу карэце!..—сустракаюць жартамі рабят з санкамі.

— Эй ты, а яшчэ сьвядомым завешся, чаму сваіх галёш ня здаў? Я вось свае здаў,—паказваючы на свае боты, зьвяртаецца безгалёшны белагур да свайго „галёшнага“ таварыша.

... Я ня зьбіраю! Пайду да якой-небудзь цёткі — давай, скажу, браслеты, пярсьцёнкі залатыя... — хваліцца вучань Кемеж. Вучняў сабралося ўжо нямала, разьбіліся яны на некалькі груп. Кожная жартуе, сьмяецца...

2. Нясецца песьня...

Ля варот школы замільгацелі чырвоныя гальштукі, гэта піонэры прышлі нам на падмогу. Пара выступаць!

— Сьмірна!.. Крокам арш! — камандуе наш „атаман“—сэкратар ячэйкі тав. Крыўко. Шарэнгамі ў чатыры крочым па вуліцах і заліваемся вясёлымі песьнямі

„Ішоў салдат з паходу,
Давай курнём разок!..“

З боку ехалі нашы экіпажы. Чацьвёра саней тарахцела па прышчах зямлі. Скрыні пакачваліся на санках... Першым імчаўся Кац і вясёла іржаў жарабём:

— І-го-го-го-ооо!

Людзі праходзілі міма, іх вочы загараліся юнацкім запалам. Яны ветліва ўсьміхаліся, нібы жадаючы дапамагаючы яму ў гэтым.

3. Ссыпны пункт—тут!

Прышлі на месца. Залілі плыньню дзьве вуліцы Захар'еўскую і Электрычную. Паміж дварамі замільгацелі групы вучняў. Ажыла вуліца, заварушылася. „Пагромшчыкі“ ўварваліся ў двор і адтуль выходзілі хто нагружаны жалезам, хто чыгуном, галёшамі, усякім рызьзём. Узвалілі ўсё гэта на санкі, і так да наступнага двара.

З парканаў заклікалі яркія афішы:

— „Дамо сталёвых коняй вёсцы!“

— „Ануча—залатая валюта!“

— „Ссыпны пункт—тут!“

Пад апошняй афішай расла і расла куча жалеза, бутэлек, чыгуну і ануч...

4. „Можна вашага сабачку падразьніць?“

Тав. К. працуе:

— Брасьлеты залатыя, пярсьцёнкі, лыжкі, відэльцы срэбныя ў вас ёсьць? —зьвяртаецца да жанчыны, якая ідзе за вадой.

— Ого, чаго захацеў! — сьмяецца тая. Ён нібы не прыкмячаючы яе здказу, так, як і раней, працягвае:

— Жалеза, чыгун, галёшы старыя, бутэлькі мы таксама прымаем. Потым, убачыўшы падбегшага да жанчыны сабачку запытаўся:

„Можна вашага сабачку падразьніць?“ Яго словы пакрываюцца сьмехам. Гэтак з жартамі, не забываючы для чаго мы прышлі, праходзім ад двара да двара.

5. „Бярэце, што знойдзеце“

Па вуліцы снуюць санкі, ад'яжджаючы нагружанымі да ссыпных пунктаў. Насельніцтва ў большасьці выпадкаў да збору адносілася добра.

Заходзім ва двор:

— Няма ў вас ніякае утыль-сыравіны?

— Бярэце ўсё, што знойдзеце!

Мы зьбіраем у дварэ, а гаспадыня тым часам выцягвае з дому аджыўшую „буржуйку“.

— Вось бярэце! Там недзе яшчэ старыя галёшы валяюцца—зараз вынесу...

6. Налёт на цётку

У раёне збору жыве цётка Швабэ. Хлопцы ўрываюцца з санкамі ў яе двор і пачынаюць „рабаваць“. Разам з сапраўдным ломам у санкі пападае яшчэ цэлы таз з анучамі і анучы з паркану. Убачыўшы гэта, цётка закрычала:

— Што вы робіце? Гэта мне яшчэ патрэбна будзе... Колькі вас ня бачыла! Заўдзеце ў хату, хоць яблыкамі пачастую...

— Э, яблыкамі не адкупішся...—сьмяюцца хлапцы.

Ачысьцілі двор, нагрузілі поўныя сані і зашлі ў хату.

— Ну, а зараз мы і ад яблык не адмовімся!..

7. „Прыяцелі“ савецкай улады

Петрапаўлаўская 101. Новы дом з вялікім дваром. Праз вакно відаць: за сталом сядзіць цёплая кампанія і, здаецца субутэльнічае. На наш грукат выходзіць поўная жанчына. Мы задаем звычайнае пытаньне:

— Ці ёсьць лом?

Яна, высунуўшы лукава морду, круціць пасалавеўшымі вачыма, заблытаўшымся языком і кажа:

— Сорам савецкай уладзе прасіць? Мы раскусілі, што гэта за птушка.

— Сорам, мабыць за тое, што мы не раскулачылі яшчэ цябе. Дачакаешся. І мы яе пакідаем адну на ганку паразважаць з ветрам. Такі-ж выпадак быў і на Электрычным завулку. Там жанчына, пырскаючы сьлюной, скардзіцца:

— Як у коопэратыве, дык нічога няма,—усё ў чарзе стой, а самім дык давай!..

Гэтыя факты гавораць, што нам трэба сур'ёзна прыглядзецца да клясавага ворага. Часам ён можа сядзець і ў сям'і рабочага.

8. Сьлязьлівая памоцніца

Зашлі да яе нашы дзяўчаты:

Ёсьць у вас, цёця, галёшы старыя, бутэлькі, рызьзё?..

—„Да чаго мы дажылі! Дзетачкі мае—зьбіраюць дрэнь розную“—разьюшылася яна.

— „Наце вось вам!“—Цягне яна адну скрыню бутэлек, а потым яшчэ... рызьзё Дзяўчаты ўхмыляючыся добрай здабычы, цягнуць з двара ўсё гэта на санкі. А яна, старэнькая бабулька, праважае іх нібы пябожчыка, вышчэраючы вочы.

9. „Фраер“ або „сьвядомы актывісты“

Чысьціліся вуліцы і двары. Пасьля нас і з мікроскопам не знайшлі-б нічога, падобнага на ўціль-сыравіну. Толькі ў варот і ля паркану, куча ўтылю ўжо прыкрывала надпіс: „Тут—ссыпны пункт“. На вуліцы паказаліся дзьве павозкі з чырвонымі сьцяжкамі над дугой. Нам засталося толькі зрабіць пагрузку сабранага. Тав. Бунін у шэрым паліто з футравым каўняром. у пальчатках павярнуўся:

— Ну, трэба ўжо дамоў ісьці.

— А што ты сёньня зрабіў?

— Больш за цябе! –агрызнуўся той. Ён ад самай школы ўвесь час ішоў абручку з В. Па дарозе зашлі паглядзець яе кватэру, цяпер яны паглядзелі на сабраны збор лому.

Ну, вядома, пасьля такой працы трэба адпачыць. І далёка ў напрамку дому шарэе фігура В., а ззаду ішлі: В. і яе сяброўка М. Гэта работа „актывістага Буніна“.

Было яшчэ некалькі падобных „актывістых“, якія глядзелі, у якім доме жывуць прыгожыя дзяўчаты і, заўважыўшы прыемную мордачку ў акне якога-небудзь дому, заходзілі туды.

— Ах, канашка! Ну пойдзем—пасватаемся! Ішлі, і дурэлі.

10. Трапеча зямля ў чырвоным пуху

Увогуле збор прашоў добра. Коні з напруджаньнем упіраліся ў прамерзлую глебу, вязучы высока нагружаныя вазы.

Вуліцы апусьцелі. Замерла ўскраіна. Зацiхлі сабакі, а да цэнтру гораду цягнуліся падводы. На іх гарою чарнела жалеза, каб потым люстрана заблішчэць часткаю трактару.

Тарахтахкалі вазы дзеля таго, каб потым стракаталі трактары!

... А ў паветры птушкамі білісь чырвоныя сьцяжкі над дугамі.

Збор уцілю

Зарысоўка юнкора „Сіні Ліст“

Адны працавалі актыўна, а Бунін разважаў з Верабей

ЗЛОМІМ І ЛІКВІДУЕМ КЛЯСУ КУЛАКОЎ

Асяродак увагі комсамолу—на будаўніцтва новых колгасаў, суцэльную колектывізацыю, апіраючыся на сапраўдны масавы рух батракоў, бедняты і серадняцтва

Суцэльная ў дзейнасьці

Вёска мяняе сваё аблічча. Яна рушыць шпаркімі тэмпамі наперад да суцэльнай колектывізацыі, узьнімаюцца масы батрацтва, беднякоў і серадня коў

Воўк у авечай скуры

Кулак адчувае сваю пагібель і таму пушчае ў ход самыя рознастайныя спробы зьмяніць сваё аблічча, замаскаваць свой кулацкі твар, але пад авечай скурай воўчых клыкоў не захаваеш.

Вось гэта заява, што зараз ляжыць перада мной, яскрава гаворыць аб гэтым. Падаю бяз зьмен.

У СМАЛЯВІЦКІ РАЙВЫКАНКОМ

ад г-н в. СЛАБАДА, Варатоўскага сельсавету. ГАНЧАРЫКАВЫХ АНТОСЯ І МАЦЕЯ.

Заява

„У нас у Варатоўскім сельсавеце праходзіць колектывізацыя. Нашага бацьку Ганчарыка Сяргея—як заможніка і кулака ў колгас ня прымуць і нават высяляць з межаў сельсавету. На сходзе моладзі, які адбыўся ў в. Слабадзе, прадстаўнік з Менску тав. Каган казаў, што нам, як дзецям кулака можна ўступіць у колгас і хадатайнічаць перад РВК аб дачы права голасу. Мы, як малапісьменныя пойдзем па шляху, па якім нам дыктуе савецкая ўласьць(?!) і ад свайго бацькі, як ад кулака адмаўляемся... Мы ўсе жадаем уступіць у колгас і ўнесьці ўсю маёмасьць, а таксама парваць усякую сувязь з бацькам. Просьба РВК разабраць найхутчэй нашу справу, уставіць нас у правох голасу і залічыць нас у сябры колгасу". (Далей ідзе пералічэньне маёмасьці і складу іх сем'яў).

Гэта не адзіная заява, яна адна дзесяткаў заяў, якія бязупынна паступаюць у РВК, райком партыі сельсаветы.

Ёсьць і больш хітра-замаскаваныя спробы пралезьці ў колгас. У Варатоўскім сельсавеце, КУЛАК МУРАШКА, ведаючы, ШТО ЯГО Ў КОЛГАС НЯ ПРЫМУЦЬ, ПАЧЫНАЕ АДНЫМ З ПЕРШЫХ ДАБІВАЦЦА ОРГАНІЗАЦЫІ КОЛГАСУ, МЯРКУЮЧЫ ТАКІМ ЧЫНАМ ПРАЛЕЗЬЦІ Ў ЯГО, але гэта яму не удалося. Мурашку ў колгас ня прынялі. У Вярхмені ў колгас „Добрая Воля" ПРЫНЯЛІ БЫЛОГА ДЗЯКА, у Смалявічах прымаюць у колгас КУЛАКА НАВІЦКАГА і толькі дзякуючы настойлівасьці парторганізацыі кулакі выключаюцца з складу колгасаў. Гэтыя факты гавораць аб тым, што колгасьнікі яшчэ не ўсьвядомілі як сьлед сутнасьць колектывізацыі.

Кулак, выступаючы супроць колектыву, імкнецца захаваць сваё аблічча пад рознымі вопраткамі і разважаньнямі. На нарадзе па сельска-гаспадарчай кооперацыі, якая нядаўна адбылася ў Смалявічах, было цікавае выступленьне ЗАМОЖНІКА ШЫМАНСКАГА, ён заявіў: „НЯХАЙ ІДУЦЬ РАНЕЙ РАБОЧЫЯ І СЛУЖАЧЫЯ Ў КОЛГАС І КЛАДУЦЬ СВАЕ ГРОШЫ, А ПОТЫМ МЫ ПОЙДЗЕМ"

Кулацкая контратака

Калі-ж нельга больш хаваць сваё аблічча, кулак уступае ў адкрытае змаганьне, у барацьбу супроць колгасу. Ён хітры—ён зьяўляецца „толькі" организатарам, а дзейнічаюць за яго наймасьцей: несьвядомы бядняк, ці батрак за які-небудзь абяцаны паркаль ці іншыя падаруна

У Аміль—наўскім сельсавеце мяжуецца з Астрашыцка- Гарадзецкім раёнам, дзе кулакамі было організавана на сходзе па колектывізацыі САБАЧАЕ ВЫЦЬЦЁ Ў МЭТАХ зрыву сходу.

Падобныя факты мелі месца і ў Астрашыцка-Гарадзецкім раёне.

Кулакі ў Варатоўскім сельсавеце ў размовах з суседзямі кажуць: „Пакуль у мяне на плячох галава, датуль ня будзе колгасу".

Кулак нахабна заяўляе, калі ў яго апісваюць жывёлу, каб недапусьціць разбазарваньня і зьнішчэньня: „ПІШЭЦЕ САБЕ, А ЖЫВЁЛУ ЗАРЭЖАМ, ГОРШ ЯК ЦЯПЕР НЯ БУДЗЕ".

Трэба паскорыць сьледзтва, якое да-рэчы сказаць, вядзецца досыць марудна і моцна ўдарыць па тых, хто выстаўляе кулацкія клыкі,

ударыць так, каб іншым было не зайздросна! Партыйныя і комсамольскія ячэйкі павінны праводзіць рашуча лінію партыі на ліквідацыю кулацтва, як клясы.

Дэзэртыры

Інакш, як дэзэртырамі іх назваць нельга. Гэта адзінкі комсамольцы і партыйцы, якія добра ведаюць дырэктывы партыі аб колектывізацыі вёскі, прапрацоўвалі іх у гуртках, у політ-школах, часта самі агітуюць сялян ісьці ў колгас. А калі перад імі рубам ставіцца пытаньне:—„Ці ў колгас, ці ты—не партыец і не комсамолец"—яны выбіралі апошняе.

Член партыі УМІНСКІ на прапанову райкому ісьці ў колгас адказаў: „Я РАБОЧЫ. А РАБОЧЫЯ Ў КОЛГАСЫ НЯ ІДУЦЬ. ЧАМУ ВЫ САМІ НЯ ПОЙДЗЕЦЕ Ў КОЛГАС?..

Ці адрозьніваецца чым-небудзь яго заява ад ніжэй пададзенага выступленьня заможніка Шымановіча, з яго заявай: „Хай раней ідуць рабочыя і служачыя, а потым і мы пойдзем".—У абодвух выпадках гэта - імкненьне падарваць колектывізацыю. Сярэдзіны ня можа быць; ХТО НЕ ЗА КОЛЕКТЫВІЗАЦЫЮ, ТОЙ СУПРОЦЬ ЯЕ!

У Жодзіне кандыдат партыі комсамолка РОЗУМ на прапанову ісьці ў колгас адказала: „ШТО Я БУДУ РАБІЦЬ У КОЛГАСЕ? ДА ВЯСНЫ ПАЧАКАЮ, А ТАМ МОЖА ПАЙДУ". Розум зараз выключана з партыі і комсамолу. У Смалявіцкай местачковай савецкай ячэйцы комсамолец-серадняк, здаровы хлапец, калі яму прапанавалі ісьці ў колгас, заявіў: „Я ПРЫНЯСУ СПРАЎКУ АД ДОКТАРА, ШТО Я НЕ МАГУ ПРАЦАВАЦЬ".

У Смалявіцкім райвыканкоме ёсьць заява НАСТАЎНІЦЫ МАЖЭЙКА, прачытаўшы якую даводзіцца толькі дзівіцца. Настаўніца Мажэйка хоча ўступіць у колгас, але пры гэтым яна высоўвае такія патрабаваньні. Яна ўступіць у колгас і ўнясе пай 250 рублёў з растэрміноўкай на два гады, пры ўмове калі...

1. НЯ БУДУЦЬ ПРЫМУШАЦЬ ЯЕ ЗАЙМАЦЦА ФІЗЫЧНАЙ ПРАЦАЙ.
2. БУДУЦЬ АДПУШЧАЦЬ ПРОДУКТЫ ПА ЦЬВЁРДАЙ ЦАНЕ.
3. КАЛІ ЗА РАХУНАК КОЛГАСУ ЁЙ БУДЗЕ ВЫПІСВАЦЦА ГАЗЭТА „САВЕЦКАЯ БЕЛАРУСЬ".
4. КАЛІ БУДУЦЬ АПЛАЧВАЦЬ КВАТЭРУ.
5. КАЛІ ПРЫ ЎСІХ ГЭТЫХ УМОВАХ ОБЛІГАЦЫІ ПАЗЫКІ ЗАСТАЮЦЦА Ў ЯЕ НА РУКАХ І ВЫЙГРЫШЫ ІДУЦЬ У ЯЕ КАРЫСЬЦЬ.

Чым-жа як ня зьдзекваньнем над колектывізацыяй можна кваліфікаваць такую заяву? Ці можа гэта настаўніца выхоўваць дзяцей у колгасе? Бязумоўна—не.

Баявы штаб

Зараз тут самыя популярныя словы: „колгас, колектывізацыя"—у розных злучэньнях і зьменах. Увесь дзень шуміць будынак райкому партыі. Прыходзяць за парадамі колгасьнікі, з групам урываюцца раённыя працаўнікі, мясцовыя комсамольцы і студэнты прыехаўшыя на вакацыі. Працы-ж па колектывізацыі хоць адбаўляй. У раёне ўсяго толькі 17 колгасаў. За 1930 год раён павінен быць цалкам колектывізаваны. Наперадзе па колектывізацыі ідзе ВЕРХМЕНСКІ сельсавет, які колектывізаваны на 90 проц. У ХВАСЬЦЕ плятуцца—ЗАБАЛОЦКІ, ДУРАЎСКІ І СМАЛЯВІЦКІ сельсаветы. Комсамольскія ячэйкі раёну праводзяць вялікую работу па колектывізацыі, пры ячэйках створаны ўдарныя брыгады з комсамольцаў сельсавецкага активу.

Там, дзе партыйныя ячэйкі шчыльна падышлі да пытаньняў колектывізацыі - ёсьць значныя дасягненьні ў гэтай галіне. У ЗЬВЯЗКУ З КОЛЕКТЫВІЗАЦЫЯЙ ПАВЯЛІЧЫЛАСЯ ЎСТУПЛЕНЬНЕ Ў ПАРТЫЮ БАТРАКОЎ І КОЛГАСЬНІКАЎ, ЯКІХ ЗА АПОШНІ ЧАС ПРЫНЯТА 15 ЧАЛАВЕК. У КОМСАМОЛ УСТУПІЛА 30 ЧАЛАВЕК КОЛГАСЬНІЦКАЙ МОЛАДЗІ.

У іншых ячэйках раёну, комсамольцы і працоўная сялянская моладзь свой юнацкі энтузіязм, комсамольскі баявы задор, маладыя сілы кладуць на справу колектывізацыі. ЗАЛЕСКІ АНДРЭЙ—комсамолец-батрак хварэе за кожны недахоп колгасу, батрачка-комсамолка ГАРДЗЁМОК—прыкладная колгасьніца, яна ўступіла ў колгас разам з бацькам. СЯРМЯЖКА АНДРЭЙ таксама адзін з лепшых колгасьнікаў і шмат іншых.

Руйнуюцца межы

Я быў на раённым зьезьдзе колгасьнікаў, я чуў, як адзін за адным выходзілі на трыбуну дэлегаты зьезду, як простымі словамі яны віталі зьезд, гаворачы аб сваіх цяжкасьцях, аб новых нязнаных днёх, аб будове новага радаснага, аб цяжкасьцях, якіх яшчэ так многа на шляху—вераю ў перамогу палалі іх прамовы. На зьезьдзе поплеч сядзелі батрацтва бедната і серадвякі беларусы, яўрэі, палякі.

Соцыялістычныя тэмпы нашага жыцьця, руйнуючы межы на сялянскіх палёх, руйнуюць і тыя нахілы чалавечага розуму, дзе брудным наростам месьціцца нацыянальная абмежаванасьць і нацыянальная варожасьць.

„НАЙЭ ЛЕБН"—так завецца буйны, нядаўна організаваны яўрэйскі колгас—цяпер усё больш і больш становіцца інтэрнацыянальным. „НАЙЭ ЛЕБН"—(Новае жыцьцё), як горда гучаць з вуснаў колгасьніка беларуса гэтыя словы. Сёньня ён, былы парабак з маёнтку былога пана Ваньковіча, і стары Бэрка, агульнымі патугамі будуюць новае жыцьцё.

Позна вечарам, калі ўжо скончыўся райзьезд колгасаў, прышлі з вёскі студэнты і паведамілі:—„Вось пастанова сходу аб організацыі колгасу".—Новы атрад уключыў сваю энэргію ў справу колектывізацыі. Сёньня нельга пісаць сталыя лічбы аб колектывізацыі, бо тое, што было адпавядаючым для ўчора, для сёньня ўжо не падыходзіць. Жыцьцё шпаркімі крокамі рушыцца наперад.

Вёска Кляпік за дзесяткі кілёмэтраў знаходзіцца ад чыгункі, ад райцэнтру. У школе, калі праводзілася гутарка аб колектывізацыі, на запытаньне кіраўніка да дзяцей: „Ці пойдзеце вы ў колгас"—вучні дружна адказалі:—„Пойдзем".

АЛЕСЬ ЛІПНЕВЫ.

М. Смалявічы. Мен. акр.

Зломім кулацкае супраціўленьне

Да 1930 году па Жлобінскаму раёну было колектывізавана сельскай гаспадаркі ўсяго на 3 проц. А на 1-га лютага г. г. раён колектывізаваны на 63 проц. Гэты факт сьведчыць аб тым, што ў Жлобінскім раёне шпаркім тэмпам ідзе справа колектывізацыі, а разам з гэтым раскулачваньне кулацтва, ліквідацыя яго, як клясы.

На сёньняшні дзень па Жлобінскаму раёну раскулачана больш чым 200 кулацкіх гаспадарак. Гэта праца ўпяршыню пачалася РВК-ам прыблізна з 20-га студзеня г. г. раскулачваньне праходзіць пры актыўным удзеле беднякка-серадняцкіх мас, аб чым сьведчыць такі прыклад:

У Дабрагошчынскім сельсавеце не атрымаўшы дырэктыў аб раскулачваньні з РВК—сход бедняты, на якім абгаварвалася пытаньне аб колектывізацыі, пастанаўляе раскулачыць кулакоў Амяльлянавых, якія разбазарвалі сваю гаспадарку, прадалі каня, дзьве каровы, збожжа і іншую маёмасьць, актыўна выступалі супроць колектывізацыі.

Назаўтра пасьля сходу ад Амяльлянавых было забрана і перададзена ў мясцовы колгас: 8 кароў, 18 авечак, 4 коняй, 40 пудоў жыта і інш. Патрэбна адзначыць, што да гэтага часу райвыканком мала звярочваў увагі на справу раскулачваньня Дабрагошчынскага сельсавету і амаль не накіроўваў туды сваіх прадстаўнікоў, у той час калі ў гэтым сельсавеце падобных Амяльлянавых шмат. І толькі зараз райвыканком выправіў сваю памылку і накіраваў туды прадстаўнікоў.

Кулацкая частка, як ніколі, выказвае актыўнае супраціўленьне справе выкананьня дырэктыў партыі і мерапрыемствам савецкай улады, фарсыраваным тэмпам збывае сваю маёмасьць.

За студзень месяц кулацкай часткай Жлобінскага раёну прададзена каля 200 галоў коняй і кароў апрача дробнай жывёлы. Так, напрыклад, кулак Віндароўскі Раман з Чэцьвярненскага сельсавету ў студзені месяцы прадаў дзьве каровы, кулак таго-ж сельсавету Курбацкі Базыль прадаў у адзін час аднаго каня, 1 карову, цёлку і тры авечкі.

Кулак Ліцьвінка Піліп з Дабрагушчынскага сельсавету прадаў адразу тры каровы і наогул такіх фактаў па Жлобінскім раёне шмат.

Трэба адзначыць, што райвыканком у справе барацьбы з супраціўленьнем кулацтва знаходзіцца на належнай вышыні і 5-га лютага організаваў конфіскацыю маёмасьці і перадачу яе колгасам ад 200 кулакоў. У Страшынскім сельсавеце меў мейсца выпадак, калі па нядбайвасьці старшыні сельсавету быў абкладзен індывідуальным сельска гаспадарчым падаткам бедняк Андрухаў Сямён і потым прызначаны да раскулачваньня. Супроць гэтага РВК прыняў адпаведныя меры і абвясьціў сельсавету вымову.

Комсамольскія ячэйкі не на лініі агню

Ня гледзячы на тое, што з боку раённага камітэту КСМ своечасова была праведзена падрыхтоўчая праца па ўдзелу комсамольцаў у справе колектывізацыі раёну, але і на сёньняшні дзень мы маем яўна-кулацкія выступленьні комсамольцаў супроць колектывізацыі, вядома ў паасобных ячэйках.

Прывядзем некалькі прыкладаў. Пасьля організацыі колгасу—сэкратар Бухарынскай ячэйкі Харчанка напісаў колектыўную заяву ад групы сялян аб выключэньні іх з колгасу. Сэкратар Верхне-Альбінскай ячэйкі ЛКСМ спачатку ўступіў у колгас, а на другі дзень выпісаўся.

Комсамольцы Мормапскай ячэйкі ў ліку 4 чалавек, у час правядзеньня сходу колектывізацыі актыўна выступалі супроць організацыі колгасу ў іх вёсцы і заяўлялі, што лепш у горад пойдуць вуліцы месьці, чым уступяць у колгас. Паасобныя комсамольцы Міхедаўскай і Чырвона-Берагаўскай ячэйкі на сходах выступалі і заяўлялі: «Мы не ворагі сваім бацьком, каб агітаваць іх уступіць у колгас».

Такіх прыкладаў маецца шмат і ў іншых ячэйках. Праўда, гэтыя комсамольцы ўжо выключаны, але ўся комсамольская організацыя не мобілізавала свае сілы на барацьбу з праявамі права-опортуністычнай небясьпекі ў Жлобінскай організацыі. Да рэчы сказаць, раённы камітэт партыі нават не займаўся гэтым пытаньнем і лічыць, што гэта справа райкому комсамолу.

Усе гэтыя прыклады сьведчаць аб тым, што партыя своечасова паставіла пытаньне аб суцэльнай колектывізацыі і зьнішчэньні кулацтва, як клясы.

Трэба толькі мобілізаваць на гэту справу ўсе сілы, усю ўвагу як партыйнай, комсамольскай, профсаюзнай організацыі, так і батрацка-бедняцкага і серадняцкага актыву вёскі.

Полацкі.

Суцэльная ў Бягомльшчыне

Бягомльская партыйная комсамольская організацыя шчыра прынялася за перабудову старой вёскі на новы лад. Калі на 1-ае мая 1929 году па раёну налічвалася 16 колгасаў—у сучасны момант налічваецца 30 буйных колгасаў са значна большымі абшарамі зямлі.

У в. Замасточча, Асаўскога сельсавету організаваўся буйны колгас на абшары з 2000 гэктараў зямлі. У гэтым колгасе канчаецца пабудова хэмічнага заводу, які будзе выпрацоўваць крэм, воцат і іншыя рэчы.

Партыйныя і комсамольскія ячэйкі стварылі з сваіх сяброў ударныя брыгады, якія штодзённа працуюць па вёсцы па-колектывізацыі. Дзеля больш сталага абслугоўваньня колгасаў—організавана 3 куставых аб'яднаньні ў м. м. Мсьціжы, Бярэзіне, Ліпску і Асаўскім сельсавеце. Пры куст. аб'яднаньнях будуць створаны трактарныя калёны для абслугоўваньня колгасу.

Былі выпадкі, калі кулакі: Палітыко і Арлоўскі в. Сабалёўка, Мсьціскага сельсавету, пралезьлі ў колгас „Леніна", але ў сучасны момант яны ўжо вычышчаны адтуль

Раённая конфэрэнцыя КП(б)Б і комсамолу ўхвалілі: аб'явіць у Бягомльскім раёне суцэльную колектывізацыю. Прасіць савецкі ўрад аб выпуску першай пазыкі колектывізацыі. Усе партыйцы Бягомлю падпісаліся на пазыку. Служачыя і рабочыя падпісаліся на пазыку колектывізацыі на 100 проц. месячнай заработнай платы.

А. БУЗА.

„Няхай раўнаюцца па нас“

Кіраўнікі „Вэзувія“ недаацанілі ролі соцспаборніцтва

Нова-Беліцкая запалкавая фабрыка „Вэзуві“ уступіла ў соцспаборніцтва ў чэрвені месяцы 1929 году. Такое позьняе ўступленьне ў соцспаборніцтва тлумачыцца тым, што кіраўніцтва фабрыка няправільна арыентавала ўвесь рабочы колектыў. Яно ўпэўнівала, што паказальнікі фабрыкі зьяўляюцца лепшымі за паказальнікі іншых запалкавых фабрык трэсту і ўсяго Саюзу. Выходзячы з гэтага, кіраўнікі фабрыкі гаварылі; **што болей зьніжаць сабекошт нельга, а павышэньне вытворчасьці працы зьвязана выключна з правядзеньнем мэханізацыі.** (і?) Дагаварыліся і да большага, **што быццам ім няма па кім раўнацца, няхай раўнаюцца па іх.**

Гэта дэзорыентавала волю рабочых фабрык у пытаньні выкананьня вытворчай праграмы і зьніжэньня сабекошту, карыстаючыся мэтадамі соцыялістычнага спаборніцтва. Партыйныя і профэсыянальныя організацыі хаця і выступалі супроць такой орыентоўкі, але мякка, чаму і не дабіліся пераломy ва ўцягненьні ўсяго рабочага колектыву ў соцыялістычнае спаборніцтва.

Ініцыятыва, якая прашла міма кіраўнікоў

Выкліканы спачатку ўздым рабочай ініцыятывы ня быў замацаваны, фабрычныя організацыі абмежаваліся заключэньнем соцдагавору і падшыўкаю яго да справы, не вядучы штодзённай работы па праверцы дагавору. У накатальным цэху пад уплывам асобных антысавецкіх элемэнтаў пагоршылася працдысцыпліна, і якасьць продукцыі. Партыйныя і профэсыянальныя організацыі прашлі міма гэтага факту, сваечасова на іх не рэагавалі. Сярод асобных груп рабочых фанэрнага заводу (які знаходзіцца пры фабрыцы) наглядалася невыкананьне заданьня, захаваньне сапраўднага выпуску ў сушцы, паменшэньні вытворчасьці працы ў скрыначным цэху на ўнутраных варштатах і г. д. Мае месца і рвацтва з боку паасобных рабочых, яны заяўляюць, напрыклад: **„забясьпечце нас раней жырамі, а потым патрабуйце падняцьця вытворчасьці працы“** і інш.

Фабком не дапамагаў організацыі соцспаборніцтва паміж зьменамі, цэхамі і варштатамі, ён ня прыняў удзелу ў распрацоўцы практычных мерапрыемстваў па кожнаму варштату, або машыне. Выклікі асобных цэхаў на спаборніцтва другімі цэхамі не падхопліваліся. Профцэхбюро не зьяўляліся організатарамі і кіраўнікамі соцспаборніцтва ў цэху, не організоўвалі мас рабочых навокал выкананьня задач, узятых на сябе.

Ня было ніводнае вытворчае нарады

За ўвесь час спаборніцтва (3 месяцы) ня было склікана ніводнай вытворчай агульна-заводзкай нарады па пытаньню соцспаборніцтва і стану выкананьня соцдагавору. З 7 цэхавых вытворчых камісій у трох ня было ніводнага паседжаньня. Фабком таксама ня прыняў ніякіх захадаў да ажыўленьня работы цэхавых вытворчых камісій. Вучот прапаноў вытворчых камісій і нарад, а таксама і паасобных рабочых, як завода-кіраўніцтвам, гэтак і агульна-зіводзкай вытворчай камісіяй не наладжаны. Справаздачнасьці перад рабочымі няма. Фабком і цэхпрофбюро да гэтага часу не азнаёмілі рабочых з дэкрэтам СНК аб вытворчых нарадах і камісіях.

Фонд прэміяваньня па соцспаборніцтву, які на 1-10-29 г. складаў 900 рублёў, **ня быў выкарыстаны.** Адсутнічала якая-б там ні было работа па выяўленьню лепшых вытворцаў і ударнікаў,—а яны былі і ёсьць, унесена шэраг эканомічна-карысных прапаноў, якія ўжо праведзены ў жыцьцё. Гэта, зразумела, адбілася на далейшым паступленьні прапаноў ад рабочых. Камісія па рабочаму вынаходзтву адсутнічае, дзякуючы чаму шэраг рабочых вынаходзтваў ня могуць дабіцца ажыцьцяўленьня сваіх вынаходніцтваў.

Яшчэ і па гэты час у некаторых цэхах адсутнічаюць ударныя брыгады. Віна тут кладзецца на ўсе завадзкія організацыі, якія не растлумачылі значэньня брыгады і не організавалі іх. Дзякуючы гэтаму некаторыя рабочыя адмаўляюцца ўдзельнічаць ва ўдарных брыгадах. Тыя-ж брыгады, якія ўжо організаваны, не атрымліваюць ніякага кіраўніцтва і дапамогі ў рабоце.

Вывад адзін—трэба ўсім фабрычным організацыям безадкладна выправіць дапушчаныя памылкі, як мага шырэй разгарнуць соцыялістычнае спаборніцтва, выканаць дырэктыву партыі аб ленінскім закліку ва ўдарныя брыгады, што і паскорыць выкананьне і перавыкананьне вытворчых заданьняў

В. Сідарук.

Нам пішуць

100 тысяч эканоміі

На будаўніцтве мясного камбінату ў г. Воршы спачатку сэзону ячэйка ЛКСМБ узялася за разгортваньне соцспаборніцтва, у якое паступова ўцягваліся ўсёю масай дарослыя рабочыя. За гэты час у кожным цэху былі організаваны ўдарныя брыгады, заключаны ўмовы з аднароднымі будаўніцтвамі ў Армавіры, Вятке і Белдзяржбудзе, рабочая моладзь не плялася ў хвасьце, а вырашала пытаньні па баявому. Зараз як вынік спаборніцтва маем вельмі прыватныя лічбы эканоміі на будаўніцтве чыгуначнай веткі, якая дала 100 тысяч эканоміі. Таксама маем па ўсіх аб'ектах працы рацыянальныя скарыстаньні будаўнічага матар'ялу і зьніжэньне сабекошту яго. П'янства, прагулы калі мелі мейсца з пачатку будаўнічага сэзону, дык зараз яны амаль зусім адсутнічаюць. Асабліва трэба адзначыць працу ленінскія дні па вярбоўцы рабочых ва ўдарныя брыгады. У час якіх пасьля дакладу сэкратара АК КП(б)Б тав. **Віленстовіча** ўсё будаўніцтва аб'явіла сябе ударным. Адстае ў гэтым мэханічны цэх. Зараз трэба ячэйцы КП(б)Б і ЛКСМБ замацаваць пад'ём рабочых, а таксама зьвярнуць увагу на разгортваньне індывідуальнага соцспаборніцтва.

Лапінскі.

Чаму гэта так?

З чысткі ячэйкі ЛКСМБ фабрыкі „Адраджэньне“ Каждан Хася выключана з комсамолу, як чужды элемэнт, а потым была зьнята і з работы. Бацькі яе ў 1928 годзе трымалі краму,—буйныя гандляры. Яна дзякуючы піонэратраду пралезла ў комсамол, папала на курсы ЦІП'у, а потым і на фабрыку. Працуючы паўтара гады на фабрыцы, увесь час жыла са сваімі бацькамі—нэпманамі.

Цяпер яна вучыцца на першым курсе вячэрняга рабфаку, раней займалася на курсах павышага тыпу. Не парвала сувязі з бацькамі і па сёнешні дзень. „Лёгкая кавалерыя“ зьвярнулася да загадчыка навучальнай часткі рабфаку тав. Семановіча па гэтаму пытаньню, ён заявіў: „Дашлеце дакуманты аб тым, што яе бацькі ў 1928 годзе трымалі краму, бо ў анкеце яе паказана, што пяць год не гандлююць“. „Кавалерыстыя“ дасталі гэтыя дакуманты, але ня гледзячы на гэта, яна і па сёнешні дзень вучыцца на рабфаку.

„Л. К.“.

ПАТРАБАВАНЬНІ РАБОЧЫХ АЖЫЦЬЦЁЎЛЕНЫ

Нядаўна ў газэтах пісалася аб тым, што рабочыя чыгункі (Менск) патрабавалі ад Гарсавету адабраньня чыгуначнай царквы ў карысьць працоўных. Гарсаветам патрабаваньне задаволена і 5-га лютага пастанова прыведзена ў выкананьне. Крыжы зьняты. Усе мэталёвыя рэчы пойдуць у карысьць індустрыялізацыі.

Нядаўна на Нова-Барысаўскім заводзе „Домбаль“ адбыўся суботнік на карысьць колектывізацыі.

На здымку: комсамольцы пасьля суботніку качаюць старога рабочага т. Рудзінскага, які вышаў на суботнік з усім колектывам.

Ф. Купцэвіч выключан з „Узвышша“

У „Зьвязьдзе“ № 296 зьмешчан артыкул „Лісты рэнегата“, які характарызуе Фэлікса Купцэвіча, як НАЦЫЯНАЛ-ДЭМОКРАТА І АНТЫСЭМІТА.

Літаратурна-мастацкае згуртаваньне „Узвышша“, разгледзеўшы гэтае пытаньне 30 сьнежня 1929 г. на агульным сходзе сваіх сяброў і лічачы сумяшчальным яго прабываньне ў пролетарскім згуртаваньні—ВЫКЛЮЧЫЛА ФЭЛІКСА КУПЦЭВІЧА З ЛІКУ СВАІХ СЯБРОЎ.

БЕЛАРУСКАЕ ЛІТАРАТУРНА-МАСТАЦКАЕ ЗГУРТАВАНЬНЕ „УЗВЫШША“

ШАХМАТЫ і ШАШКІ

ЗАДАЧА № 3 Н. РАТНІКОВА (Горкі Аршаншчына)

ЭЦЮД № 1 І. БЕНЕНСОНА (Барысаў)

Друкуецца ў першы раз

Бел. Кр. c1, Фb3, Kd3, Ke1 (4)
Чор. Кр. b4, пе5 (2)



Бел. Д-d8, f8, g5 (3)
Чор. Да3, пр.c3 (2)

Шашачная партыя

Гуляна ў Воршы

Роззмблюм (Белыя)	Лецкін (Чорныя)
1. c3—d4	d6—c5
2. b2—c3	e7—d6
3. g3—f4	f6—e5
4. d4:f6	g7:g3
5. h2:f4	b6—a5
6. c3—d4	f8—g7
7. d4:b6	a7:c5
8. d2—c3	g7—f6
9. g1—h2	d8—e7
10. c3—d4	c7—b6
11. c1—b2	a5—b4?

Слабы ход, які адразу праігрывае партыю.

12. d4—e5!!	f6:d4
13. f4—g5	h6:d2
14. e1:c3	паддаўся

Гэта камбінацыя нецяжкая, але фінал вельмі цікавы.

Турнір будаўнікоў

Скончыліся групавыя шашачныя спаборніцтвы менскіх будаўнікоў, у якіх удзельнічала 60 рабочых. У паўфінал вышлі 24 гульцоў; з іх 22 маладых.

Каманда-брыгада рабочых скурнікоў

У Гомель выяжджае шах.-шаш. каманда-брыгада менскіх рабочых скурнікаў з мэтаю наладзіць масавую шахматна-шашачную працу ў гомельскіх скураных прадпрыемствах.

Усебеларускі конкурс складаньня задач

Рэдакцыя газэты „Савецкая Беларусь“ аб'явіла ўсебеларускі конкурс складаньняў шахматных задач—двухходовых. Удзельнічаць могуць усе жадаючыя.

Апошні тэрмін дасылкі задач—1 мая.

Папраўка

Ва ўчарайшым нумары газэты „ЧЗ“ на першай старонцы ў шапцы ўкралася наступная памылка:

У другім падзагалоўку напісана: „Рашуча праводзіць лінію партыі і ліквідацыю кулацтва, як клясы“. Трэба чытаць: „Рашуча праводзіць лінію партыі на ліквідацыю кулацтва, як клясы“.

Рэдколегія.

За новую, бадзёрую песьню

ТРЭБА ЗАЦІКАВІЦЦА ТЫМ, ЯКІЯ ПЕСЬНІ СЬПЯВАЕ НАША ЧЫРВОНАЯ АРМІЯ. ТРЭБА ЧЫРВОНАЙ АРМІІ ДАЦЬ НОВУЮ ПЕСЬНЮ, ЯКАЯ-Б АДБІВАЛА ГЭРОІЗМ, ЭНТУЗІЯЗМ СОЦЫЯЛІСТЫЧНАГА БУДАЎНІЦТВА І ЎДЗЕЛУ Ў ІМ ЧЫРВОНАЙ АРМІІ

Пытаньне аб тым, якія песьні зараз сьпявае Чырвоная армія, набывае вялікае значэньне ў галіне падвышэньня культурнага росту чырвонаармейцаў. Зараз становішча ў гэтай галіне такое, што неабходна зрабіць рашучы пералом шляхам пастаноўкі вывучэньня гэтага пытаньня і стварэньня новай чырвонаармейскай песьні. Часта да гэтага часу чырвонаармейцы сьпяваюць усялякія „Дуні“, „Галкі ды вароны“ і. што больш цікава, на лёгкія шансонэтныя мэлёдыі пішуцца тэксты рэволюцыйнага зьместу.

Трэба адзначыць, што наша пісьменьніцкая і музычная грамадзкасьць нічога ў гэтым напрамку не зрабіла. Таксама і нашы культасьветныя ўстановы мала цікавяцца гэтай важнай справай. Кіраўніцтва дому Чырвонай арміі невялікія крокі ў гэтым напрамку зрабіла, але-ж ніякіх конкрэтных вынікаў да гэтага часу няма.

Зараз працуе ўдарная брыгада рабісаўцаў па вывучэньню з чырвонаармейцамі песьні: „Асобай Далёка-Усходняй Арміі“. Брыгада ў процэсе сваёй працы адзначае вялікую зацікаўленасьць чырвонаармейцаў гэтай песьняй, якая сапраўды адпавядае нашым сучасным запатрабаваньням як па зьместу тэксту, так і па зьместу музычнае часткі.

Ці можа наша пісьменьніцкая і музычная грамадзкасьць пры актыўным удзеле чырвонаармейцаў замяніць становішча, стварыць неабходную нам песьню? Можа і павінна.

З гэтай мэтай неабходна організаваць сустрэчу чырвонаармейцаў з нашай музычнай і пісьменьніцкай грамадзкасьцю, для чаго правесьці спэцыяльны вечар, на якім абгаварыць гэта пытаньне, добра пакрытыкаваць старыя песьні, адначасова наладзіўшы іх выкананьне нашымі сьпевакамі. На самым вечары абмяняцца думкамі і знайсьці канкрэтныя шляхі стварэньня такой чырвонаармейскай песьні, якая-б сапраўды несла пачэснае імя—„Чырвонаармейскай“.

М. РУБІНШТЭЙН.

Паведамленьні

У панядзелак 10/II—1930 г. а 6 гадзіне ўвечары ў памяшканьні ЦК ЛКСМБ адбудзецца пасяджэньне Канфліктнай Камісіі ЦК ЛКСМБ.

Яўка ўсіх членаў КК ЦК абавязкова.

Выклікаюцца на пасяджэньне КК па сваіх справах наступныя т.т.: Вынюкова, Матэвушаў, Хадановіч, Пашкоў, Кудзелева (Магілёў), Мітлін (Віцебск) Гудзіна, Вержбіцкі, Стральцоў Арцэменка, Гудына М. Дзяргачова, Грыгорьева. А. Нікančук (Ворша), Рабейчык. Папко А. Рапапорт, Гаврушка (Бабруйск), Казак А., Голад Р. Гузман Х. Зьмітраніца Я. Неманман (Мазыр), Серафімовіч (Менск), Башмакова М. (Гомель).

Праезд за свой кошт.

Старшыня КК ЦК ЛКСМБ **Рындзіч.**

У суботу 8-га лютага, у памяшканьні Дому Комсамолу Мен. АК ЛКСМБ склікае нараду Бюро Юн. сэкцый, па пытаньню правядзеньня 3-х месячніка пралатарскай культуры і аб падрыхтоўцы да зьлёту „Л. К.“

Пачатак а 6 гадз. увечары.

Мен. АК. ЛКСМБ.

Фрунзэускі РК ЛКСМБ.—Сёньня, а 6-ай гадзіне ўвечары адбудзецца паседжаньне бюро ФРК ЛКСМБ.

Сход поэтаў і пісьменьнікаў

адбудзецца 8 лютага а 7 г. увечары ў Доме Пісьменьніка

ПАРАДАК ДНЮ:

1) Аб уваходзе пісьменьнікаў у сэкцыю працаўнікоў друку.

2) Выбары Групкому.

Белбюро сэкцыі

Адказны рэдактар Рэдколегія

ЗГУБЛЕНЫ

— Комс. білет 64464, на імя Сімаменка С. А., выд. Аршанскім Акр. ЛКСМБ.

— Комс. білет 21902, на імя Окунева П. Ун., выд. Мен. Акр. ЛКСМБ.

Менск, друкарня БДВ. Галоўлітбел № 599